# РАСКРЫЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЯЎ ВУЧНЯЎ ПРАЗ ФАРМІРАВАННЕ Ў ІХ НАВУЧАЛЬНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ДЗЕЙНАСЦІ ТЭАТРАЛЬНАГА ГУРТКА "СВІТАНАК" У 2017–2021 гг.)

*Арцямёнак Антон Генадзевіч*

***Аннотация.*** *У сучаснай сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь фарміраванне навучальных кампетэнцый – адзін з найважнейшых складнікаў паспяховага авалодання вучэбнымі дысцыплінамі. Развіццё дадатковай школьнай адукацыі праз з'яўленне ва ўстановах адпаведных гурткоў творчай і мастацкай накіраванасці спрыяе ўжыванню моўнай і камунікатыўнай кампетэнцыі ў практычным узаемадзеянні з вучнямі з мэтай іх арыентаванасці на ўдасканальванне творчых і маўленчых навыкаў. Агляд метадычных распрацовак па заяўленай тэме, выкарыстанне ўласнага вопыту дапамагае знайсці практычнае выйсце ў напрамку развіцця тэатральнага майстэрства ва ўстановах адукацыі.*

Развіццё тэатральнага мастацтва як культуралагічнага кампанента ў сістэме школьнай адукацыі мае значную педагагічную і псіхолага-матываваную скіраванасць. Гэта абумоўлена шэрагам прычын. Па-першае, з набыццём незалежнасці Беларусі напрыканцы XX стагоддзя тэатр, як і іншыя сферы мастацтва, падпаў пад кардынальныя зрухі і змены, што ў цэлым адбываліся ў грамадстве на постсавецкай прасторы. Сцэнічнае мастацтва набыло новы кірунак развіцця з улікам пераасэнсавання многіх маральных, духоўных і культуралагічных каштоўнасцяў. Пераасэнсаванне ролі, месца, значэння, функцый мастацкай творчасці ў жыцці чалавека і грамадства адбывалася з улікам сусветнага вопыту і ўласных нацыянальных традыцый і асаблівасцей [3, с. 65]. Па-другое, неадменным спадарожнікам паняцця "школьны тэатр" заўжды з'яўляўся выхаваўчы працэс, сэнс якога ў непасрэдным узаемадзеянні з дзяцьмі праз развіццё і фарміраванне ў іх творчых здольнасцяў, а разам з тым і прагі да авалодвання навучальнымі дысцыплінамі школьнай праграмы.

Праз авалодванне тэатральным майстэрствам у межах школьнага навучання вучні пашыраюць і ўласнае ўспрыманне педагагічных і моўных кампетэнцый, дзе пільная ўвага ў першую чаргу надаецца развіццю **камунікатыўнай** кампетэнцыі. У працах лінгваметадыстаў (А. Быстрова, Г. Валочка, Л. Мурына, В. Русецкі, М. Ялінскі і інш.) адзначаецца, што камунікатыўная кампетэнцыя – гэта "здольнасць забяспечваць моўнымі сродкамі маўленчыя паводзіны ў працэсе суразмоўніцтва, ствараць і ўспрымаць выказванне ў адпаведнасці з мэтай, сферай і сітуацыяй маўлення, наладжваць кантакт з суразмоўцамі і ўключацца ў маўленчую дзейнасць" [6, с. 82]. У сваю чаргу, фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі немагчыма без ведання мовы, яе ўстойлівых нормаў, разумення значэння слоў, фразеалагізмаў і т.п. Школьны тэатр, сярод іншага, прызваны паглыбляць і ўзбагачаць слоўнікавы запас вучняў, развіваць камунікатыўныя навыкі, рытарычныя прыёмы і ў цэлым будаваць сістэму авалодання вучнем моўнай структурай. Адпаведна гэтаму ствараюцца і навучальныя планы дзейнасці школьных тэатральных гурткоў, дзе значную частку працы педагога з навучэнцамі складае комплекс моўных і фізіялагічных практыкаванняў, а непасрэдная падрыхтоўка да сцэнічных выступленняў ажыццяўляецца ўжо на базе праведзенай грунтоўнай работы па фарміраванні і развіцці ў вучняў неабходных уменняў і кампетэнцый. Зазначым, што для сучаснай лінгваметодыкі надзвычай актуальнай з'яўляецца праблема фарміравання моўнай асобы вучня.

Згодна з вышэйназваным дзейнасць школьнага тэатральнага гуртка павінна падпарадкоўвацца наступным арыентырам:

1. ***Паглыбленае развіццё ў вучняў моўных і маўленчых кампанентаў праз камунікатыўную кампетэнцыю.*** Фарміраванне ў іх ведаў па ўсім узроўням моўнай сістэмы, уменняў і навыкаў валодання беларускім маўленнем для забеспячэння камунікацыі паміж вучнямі, педагогамі і, як дасягненне канчатковай мэты, паміж акцёрамі і гледачамі. На аснове валодання фанетычнай сістэмай беларускай мовы, арфаэпічных, акцэнталагічных, граматычных, інтанацыйных уменняў і навыкаў вучні фарміруюць уласнае спалучэнне і правільнае ўжыванне ў маўленні лексічных адзінак, граматычных формаў і канструкцый. Дакладнае і дарэчнае словаўжыванне дасягаецца пры паглыбленні і дасканалым развіцці беларускай лексікі і фразеалогіі. Таму важна, каб занятці праходзілі на мове паказу будучых спектакляў, бо частае двухмоўе параджае і адпаведныя памылкі пры пабудове сінтаксічных і граматычных канструкцый у працэсе маўленчай дзейнасці. Маўленчы ж кампанент складаюць веды і рэцэптыўныя навыкі (чытанне, аўдзіраванне) у прадуктыўных відах маўлення (гаварэнне, пісьмо). Пры падрыхтоўцы адпаведнага задання вучні павінны валодаць уменнямі аналізу гатовага тэксту, яго адаптацыі да сцэнічнага ўвасаблення.

2. ***Усебаковае ўдасканальванне ўласна камунікатыўнага кампанента***, які складаюць камунікатыўныя ўменні і навыкі, што вылучаюць і адпаведную кампетэнцыю сярод іншых. У дзейнасці тэатральнага гуртка неабходна прывіваць вучню авалоданне тэкстам праз заданні, якія паглыбляюць навыкі яго аналізу. Гэта могуць быць сачыненні, пераказы, творчыя дыктанты, вусныя выступленні па загадзя падрыхтаваных тэкстах. Так, у працэсе фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі трэба ўлічваць, што, па-першае, для моўных зносін важна зразумець сітуацыю маўлення, правільна падабраць моўныя сродкі і аформіць вы-

казванне згодна з камунікатыўным намерам і мэтай суразмоўніцтва; па-другое, каб моўныя зносіны былі эфектыўнымі, неабходна ведаць нормы культуры маўлення, валодаць пэўнымі правіламі, як таго патрабуе маўленчая сітуацыя [6, с. 83].

3. ***Моўная кампетэнцыя.*** Ва ўзаемадзеянні з камунікатыўнай моўная кампетэнцыя забяспечвае сфарміраванасць у вучняў арфаграфічных, пунктуацыйных уменняў і навыкаў, здольнасць канструяваць граматычная правільныя формы і сінтаксічныя канструкцыі. Не здарма журы на тэатральных конкурсах ацэньвае прыгажосць, дакладнасць і дасканаласць мовы маладых акцёраў. Пры недахопе ўласна моўнай падрыхтаванасці губляецца сэнс паказанага спектаклю, не дасягаецца яго камунікатыўная мэта данесці правільную і рэжысёрскую задуму да гледача. На гэтым фоне падаецца неабходным на конкурсах раённага, гарадскога, абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў раздзяляць беларускамоўныя і рускамоўныя спектаклі па розных катэгорыях, каб навучэнцы знаходзіліся пры ацэньванні іх здольнасцяў у роўных умовах. Сярод неабходных практыкаванняў для паспяховага ажыццяўлення моўнай кампетэнцыі, па меркаванні Л.М. Гамезы, вылучаюцца наступныя: 1 — практыкаванні на авалоданне моўнымі і маўленча-камунікатыўнымі паняццямі (размежаванне такіх моўных з'яў, як аманімія і мнагазначнасць); 2 — практыкаванні на засваенне фармулёвак моўных і маўленча-камунікатыўных паняццяў (адкажыце на пытанне, успомніце, дайце вызначэнне, працягніце і інш.); 3 — практыкаванні на выпрацоўку аналітыка-сінтэтычных уменняў на аснове моўных і маўленча-камунікатыўных паняццяў (вызначыць спосаб пераносу значэнняў слоў, зыходзячы з пададзенай інфармацыі); 4 — практыкаванні на стварэнне вобразнага, эмацыянальнага, метафарычнага выказвання; 5 — практыкаванні на аналіз вобразна-выяўленчых сродкаў тэксту і інш. [1, с. 30–32].

Пералічаныя практыкаванні неабходны для рэалізацыі вышэйазначаных моўных і камунікатыўных задач, якія ставяць перад сабой кіраўнікі тэатральных гурткоў. Такім чынам, у працэсе навучання і творчай дзейнасці вучняў, практыкаванні вербальна-семантычнага і тэзаўруснага ўзроўняў спрыяюць засваенню вучнямі моўных і маўленча-камунікатыўных паняццяў, узвышаюць іх здольнасці, паглыбляюць лексічны запас, развіваюць творчае мысленне і імправізацыйныя ўменні.

На аснове даследаванняў у галіне тэатральнай педагогікі К.С. Станіслаўскага, М.А. Чэхава, П.М. Ершова і інш. педагог у працэсе сваёй дзейнасці ў якасці кіраўніка тэатральнага гуртка павінен валодаць наступнымі ўменнямі:

1. У думках станавіцца на месца дзіцяці, умець паглыбляцца ў яго ўнутраны свет, "чытаць" яго, аднаўляць яго пачуцці, думкі і маўленне, разумець матывы яго ўчынкаў;

2. Мадэляваць складаныя сітуацыі з жыцця дзяцей, аднаўляць іх узаемаадносіны з дарослымі, аднагодкамі, навакольным прыродным і прадметным светам;

3. Аналізаваць сітуацыю з жыцця дзяцей, усведамляць праблему, што ляжыць у яе аснове, глыбіню, характар канфлікту, стадыю яе развіцця і ўмовы разгортвання;

4. Бачыць у прамадэліраванай сітуацыі педагагічную задачу, прыводзіць яе да гуманнага, педагагічна мэтазгоднага рашэння.

Такім чынам, пры адпаведнасці вышэйназваным патрабаванням і паспяховаму рашэнню педагагічных задач можна зрабіць выснову, што сістэмнае выкарыстанне метадаў тэатральнай падрыхтоўкі (у спалучэнні з агульнапедагагічнымі і моўнымі метадамі) павышае выніковасць навучання тэатральнаму майстэрству вучняў, забяспечвае паслядоўнасць і комплекснасць фарміравання ўсіх кампанентаў разумовай дзейнасці.

Для разгляду практычнага прымянення агучаных прынцыпаў і прыёмаў, прапануем разгледзіць дзейнасць школьнага тэатральнага гуртка "Світанак" у 2017-2021 навучальных гадах.

Тэатр распачаў сваю дзейнасць на базе ДУА "Сярэдняя школа № 12 г. Віцебска" ў 2017 годзе. Выбар назвы быў абумоўлены лексічным значэннем слова з улікам яго метафарычнасці. "Світанак" як світанне таленту, дасягненне ведаў і раскрыццё творчага патэнцыялу, удасканальванне моўных навыкаў. Усякаму тэатру для дзяцей даводзіцца пачынаць з пэўных акрэсленых пытанняў: узрост дзяцей, для каго тэатр вядзе сваю работу, рэпертуар тэатра і непасрэдна форма тэатральных выступленняў.

З гуртком "Світанак" акрэсленыя пытанні рашыліся з улікам прапанаваных установай адукацыі задач і патрабаванняў. Так, галоўнай мэтай дзейнасці гуртка стаў яго ўдзел у гарадскім конкурсе "Школьны тэатр", а таксама перыядычныя выступленні на ўнутрышкольных канцэртах, прымеркаваных да розных святаў і знамянальных падзей. Работа тэатра ішла па аднолькава важных кірунках і спалучала ў сабе два аднолькава важныя элементы — элемент мастацкі і элемент выхаваўчы.

У сваіх педагагічных задачах тэатр служыць мастацтву ў цэлым, выхоўвае эстэтычна, абуджае ўласны творчы патэнцыял. Як выхаваўчы сродак тэатр служыць дзеля ўзбагачэння і ўсебаковага развіцця асобы; пастаноўкі тэатра ў ідэале павінны складаць некаторую сістэму, да таго ж кожная наступная пастаноўка па ступені сваёй эстэтычнай складанасці мае быць працягам і развіццём папярэдняй.

У 2017/2018 навучальным годзе ў тэатральным гуртку выявіла жаданне займацца невялікая група вучняў VII класа. Адпаведна спектакль падбіраўся з улікам узроставых і колькасных асаблівасцяў тэатральнай трупы. Згодна з праграмай навучання першае паўгоддзе ўключала ў сябе тэарэтычныя заняткі адносна месца прызначэння тэатра ў жыцці чалавека, сукупнасці агульных звестак пад тэмай "Тэатр як від мастацтва". Такія заняткі ўводзілі дзяцей у неабходнае рэчышча, прадстаўлялі магчымасць пазнаёміцца з новым відам мастацтва, далучыцца да яго ў сваіх бліжэйшых планах. Разам з тым, праводзіўся і комплекс практыкаванняў, скіраваных на слоўнае і фізічнае

ўзаемадзеянне школьнікаў паміж сабой. Былі заяўлены і рэалізаваны тэмы “Я ў прапанаваных абставінах” (комплекс фізічных гульняў і практыкаванняў), “Эцюд як сродак засвойвання акцёрскай граматы” (структура мастацкага эцюда, сачыненне простых эцюдаў), “Бясслоўныя элементы дзеяння” (комплекс псіхафізічных гульняў на калектыўную ўзгодненасць дзеянняў), “Слоўныя дзеянні. Размова” (індывідуальныя эцюды праз моўную кампетэнцыю, усебаковае развіццё паняцця “слова”, моўныя практыкаванні, складанне граматычна правільных канструкцый), “Драматургічны матэрыял — канва для выбару логікі дзеянняў персанажа” (завучванне на памяць урыўкаў з празаічных, драматургічных або вершаваных твораў, іх адаптацыя пад сцэнічнае выступленне).

З першага года навучання неабходна правядзенне індывідуальнай работы з выхаванцамі рознай накіраванасці: для адных – гэта пазбаўленне мышачных заціскаў, выпраўленне дэфектаў маўлення; для іншых — далейшае развіццё прыродных талентаў.

Другое навучальнае паўгоддзе заключалася ў падрыхтоўцы спектаклю да конкурсу “Школьны тэатр” на аснове засвоеных у папярэднім паўгоддзі тэарэтычных і практычных навыкаў. Для інсцэніроўкі была абрана п’еса Якуба Коласа “На дарозе жыцця”. Твор насычаны глыбокім і філасофскім зместам, мае працяглыя маналогі, тым самым ён садзейнічаў паспяховаму засваенню вучнямі моўных нормаў, спрыянню цікавасці да развіцця сваіх камунікатыўных і маўленчых навыкаў. Нездарма журы дадаткова ацаніла выканаўцу галоўнай ролі Анастасію Кундзір дыпломам “За лепшую жаночую ролю” (*Малюнак 1*).



Малюнак 1 — Сцэна з спектаклю па п’есе Якуба Коласа “На дарозе жыцця”

Такім чынам, першы год дзейнасці тэатральна гуртка “Світанак” вызначыўся замацаваннем у вучняў тэарэтычных ведаў аб тэатры як адным з відаў мастацтва. Гэты год паспрыяў развіццю і ўдасканальванню навыкаў валодання беларускай мовай, дзе камунікатыўны аспект пры навучанні меў найважнейшую ролю. Дзеці здолелі перамагчы ўласную боязь перад сцэнай, тым самым забяспечылі і сваё ўласнае эстэтычнае задавальненне дадзеным працэсам. Мова вучняў узбагацілася, з’явілася неабходная варыянтнасць у пабудове дыялогаў, што дапамагала імправізаваць і знаходзіць найлепшае калектыўнае выйсце са слоўных узаемадзеянняў на сцэне.

На наступны навучальны год у тэатральным гуртку з’явілася папаўненне, дзеці падраслі, навучэнцы з мінулагадовым сцэнічным вопытам ахвотна дзяліліся ім з новымі ўдзельнікамі. Тэарэтычны аспект навучальнага года 2018/2019 заключаў у сабе асновы навучання акцёрскай грамаце па распрацаваных методыках беларускіх тэатральных дзеячоў. На базу гуртка ў школу былі запрошаны госці з Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, сярод якіх акцёры з адпаведнымі майстар-класамі, а таксама загадчык літаратурна-рэдакцыйнай часткі тэатра Алесь Замкоўскі. (*Малюнак 2*).



Малюнак 2 — Сустрэча з акцёркай і рэжысёрам Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Ірынай Цішкевіч

Тут варта акрэсліць, што мэта факультатыўных заняткаў у тэатральным гуртку “Світанак” — навучанне асновам акцёрскай граматы, выхаванне і развіццё вучняў сродкамі тэатра і роднай беларускай мовы. Заняткі садзейнічаюць інтэнсіфікацыі такіх актуальных у старэйшым падлеткавым узросце псіхічных працэсаў, як самаўспрыманне, самапазнанне, самааналіз, рэфлексія. На аснове гэтых працэсаў у вучняў фарміруецца адэкватная самаацэнка, самапавага і, нарэшце, уласны светапогляд, што з’яўляецца важнай умовай псіхалагічнага здароўя асобы.

Заняткі ў тэатральным гуртку таксама садзейнічаюць развіццю ў вучняў цікавасці да беларускай мовы і літаратуры, нацыянальнай культуры, у выніку чаго фарміраваліся неабходныя вышэйназваныя кампетэнцыі: камунікатыўныя, сацыяльныя, грамадскія, культуралагічныя і іншыя. Удзельнікі тэатральнага гуртка “Світанак” актыўна карыстаюцца беларускай мовай у сваім паўсядзённым жыцці, чытаюць пазаўрочна творы беларускай драматургіі, слухаюць беларускую музыку. Усё гэта разам дало пэўны плён і наступную грунтоўную пастаноўку — па матывах празаічнага апавядання сучаснага беларускага пісьменніка Андрэя Федарэнкі “Рэпетыцыя”. На абмеркаваннях адносна будучай пастаноўкі вучням дазвалялася ўносіць пэўныя праўкі і рэдагаванні ў дзеянні сваіх персанажаў, што дае магчымасць ім адчуць творчую вольнасць, без псіхалагічнага напружвання ставіцца да выканання сваіх акцёрскіх абавязкаў. Атрымаўся спектакль у спектаклі, дзе вучні — удзельнікі тэатральнага гуртка — атрымліваюць важнае заданне — за некалькі дзён падрыхтаваць пастаноўку на га-

радскі конкурс. У анатацыі да спектаклю, змешчанай на афішы, напісана: “З фантазіяй у маладых творцаў праблем няма, а вось як паспець разабрацца ў сабе ды яшчэ здолець дагадзіць ва ўсім завучу навучальнай установы – пытанне, якое неадкладна патрабуе адказу...” (*Малюнак 3*).



Малюнак 3 – Сцэна з спектаклю па матывах апавядання Андрэя Федарэнкі “Рэпетыцыя”

Урэшце, у навучальным годзе 2019/2020 гурток займеў найбольшую колькасць вучняў за гісторыю свайго нядоўгага існавання. Разам з тым, маўленчыя і акцёрскія навыкі ўдзельнікаў дазвалялі звярнуцца да больш змястоўнага і аб’ёмнага твора. У якасці матэрыялу была абрана п’еса ў вершаванай форме Ніла Гілевіча “Формула іржавіны”. Па хранаметражы, багацці персанажаў і рэквізіту яна значна пераўзыходзіла дзве папярэднія, ды і была па выніках адзначана Гран-пры гарадскога конкурсу “Школьны тэатр”.

У заключэнні падаецца неабходным адзначыць, што наяўнасць у навучальных установах школьнага тэатра ў поўнай меры спрыяе засваенню вучнямі прадметаў гуманітарнага кірунку, умацаванню псіхалагічнай і маральнай устойлівасці, развіццю маральных і эстэтычных уменняў, што ў сукупнасці дае неабходны штуршок да ўсебаковага фарміравання асобы вучня. Выкарыстанне на практыцы камунікатыўнай і моўнай кампетэнцый характарызуецца павышанай матываванасцю навучэнцаў у вучэбным працэсе і паспяховым спасціжэннем імі тэатральнага майстэрства.

## Спіс літаратуры

1. Гамеза, Л.М. Сістэмна-функцыянальны і камунікатыўна-дзейнасны падыходы да навучання мове. Узбагачэнне лексічнага слоўнікавага запасу школьнікаў / Л.М. Гамеза // Народная асвета. – 2012. – № 1. – С. 29–33.

2. Гройсман, А.Л. Личность, творчество, регуляция состояний: Руководство по театральной и паратеатральной психологии / А.Л. Гройсман. – М.: ИЧП «Издательство Магистр», 1998. – 436 с.

3. Грыгаровіч, Я.Д. Прыкладная культуралогія: вуч. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці “Культуралогія” устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / Я.Д. Грыгаровіч, А.І. Смолік. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2005. – 216 с.: іл.

4. Грыгаровіч, Я.Д. Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект – Я.Д. Грыгаровіч. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2002. – 403 с.

5. Иванова, Н.В. Элементы театральной педагогики в системе профессиональной подготовки учителя / Н.В. Иванова. – Минск: Минский ордена трудового красного знамени государственный педагогический университет имени А.М. Горького, 1993. – 20 с.

6. Мартынкевіч, С.В. Камунікатыўная кампетэнцыя. Сутнасць паняцця і прынцыпы адбору зместу яе фарміравання / С.В. Мартынкевіч // Роднае слова. – 2011. – № 3. – С. 82–85.

7. Орлова, А.П. Социально-психологические проблемы современного общества и человека: пути решения: материалы международной научно-практической конференции, Витебск, 29–30 октября 2015 г. / Вит. гос. ун-т; редкол.: Е.Л. Михайлова, Н.Ю. Андрущенко, С.Д. Матюшкова; под науч. ред. А.П. Орловой; отв. за выпуск С.А. Моторов. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2015. – 238 с.

8. Ракова, Н.А. Общеобразовательная школа в условиях реформирования: состояние и перспективы: материалы международной научно-практической конференции, 13–14 ноября 2002 г. / УО «ВГУ им. П.М. Машерова»; Ред. колл.: Ракова Н.А. (отв. ред.), Тетерина В.В., Загорулько Р.В. и др. – Витебск: Изд-во ВГУ им. П.М. Машерова, 2002. – 300 с.

9. Рамончик, Н.В. Развитие гуманистической направленности личности социального педагога средствами театральной деятельности / Н.В. Рамончик. – Минск: Белорусский государственный педагогический университет им. Максима Танка, 1999. – 20 с.

10. Рувинский, Л.И. Учителю о педагогической технике / Л.И. Рувинский [и др.]; под ред. Л.И. Рувинского. – М.: Педагогика. 1987. – 160 с.

*Дата поступления в редакцию: 03.06.2022*